*Кузьмініч Т.В., Саітава В.І. (Мінск)*

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ БІБЛІЯГРАФІІ ЯК КІРУНАК СУЧАСНАГА БІБЛІЯГРАФАЗНАЎСТВА: ЗДАБЫТКІ І ПЕРСПЕКТЫВЫ

Бібліяграфія як грамадская з'ява прайшла вялікі шлях. Яе развіццё адбывалася ў цеснай сувязі з навукай, культурай, тэхнікай. Удасканальваліся яе формы, тыпы, віды, афармлялася жанравая разнастайнасць, змяняліся матэрыяльныя носьбіты яе фіксавання, ускладнялася арганізацыйная структура. Асэнсаваць яе як гістарычную з'яву ў сусветным і нацыянальным ракурсах надзвычай важна для пераемнасці накопленага вопыту, традыцый, вызначэння тэндэнцый і перспектыў развіцця. Гэта дасць падставу для ацэнкі гісторыка-культурнага стану грамадства на пэўным этапе, яго навуковага і інтэлектуальнага патэнцыялу.

Вывучэнне і параўнанне дасягненняў і здабыткаў сусветнай і айчыннай бібліяграфіі аказвае станоўчы ўплыў на фарміраванне прафесійнага светапогляду, глыбіню ацэнак сучасных з'яў і якасць прагназавання навуковага, адукацыйнага, арганізацыйна-кіраўнічага і практычнага відаў дзейнасці. Гісторыка-бібліяграфічныя веды з'яўляюцца неад'емнай часткай прафесійных ведаў бібліёграфаў. Яны могуць быць запатрабаваны пры выпрацоўцы алгарытмаў дзейнасці, прыняцці пэўных метадычных і арганізацыйных рашэнняў.

У цэнтры ўвагі гісторыі беларускай бібліяграфіі — высвятленне прычын узнікнення бібліяграфіі, яе ролі ў інфармацыйным забеспячэнні беларускага грамадства ў асобныя гістарычныя перыяды; развіццё нацыянальнай бібліяграфічнай сістэмы і асобных яе кампанентаў; фарміраванне і функцыянаванне арганізацыйных структур; дзейнасць асобных бібліёграфаў; станаўленне відавой структуры бібліяграфіі; эвалюцыя метадычных падыходаў; зараджэнне тэарэтычных уяўленняў; дасягненні беларускай бібліяграфічнай думкі і бібліяграфічнай адукацыі ў цэлым і на асобных гістарычных этапах і інш.

Гісторыя беларускай бібліяграфіі як частка айчыннага бібліяграфазнаўства арганічна ўпісваецца ў яго структуру і адыгрывае сваю, перш за ўсё мнеманічную ролю ў дачыненні да тэорыі, арганізацыі і тэхналогіі бібліяграфіі. Яна арганічна ўваходзіць у гісторыю айчыннай культуры, апісвае і аналізуе працэсы, якія адбываліся ў розныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

перыяды не толькі ў бібліяграфічнай дзейнасці, а і ў руху дакументных патокаў і масіваў, у навуковай, адукацыйнай, выхаваўчай, дасугавай сферах, тэхналагічным і інтэлектуальным развіцці грамадства.

Даследаваннем гісторыі беларускай бібліяграфіі займаліся прадстаўнікі шэрага навук і сфер практычнай дзейнасці. Гэта пераважна бібліяграфазнаўцы, гісторыкі, філолагі, крыніцазнаўцы, кнігазнаўцы, архівісты, бібліятэкары-бібліёграфы-практыкі.

Самая вялікая заслуга ў распрацоўцы гісторыі беларускай бібліяграфіі як навуковай дысцыпліны і ўвядзенне яе ў вучэбна-педагагічную дзейнасць належыць доктару педагагічных навук, прафесару БДУ культуры В.Е.Лявончыкаву, сярод шматлікіх прац якога манаграфія і падручнік. Значны ўклад у стварэнне гісторыка-бібліяграфічных ведаў унеслі таксама Л.Р.Амяльковіч, Н.Б.Ватацы, Л.І.Збралевіч, Т.І.Рошчына, Т.М.Сакалова, А.А.Сакольчык, І.Б.Сіманоўскі, Р.М.Чыгірова і інш. Бясспрэчнай каштоўнасцю фактычных даных і навізной звестак вызначаюцца працы польскіх даследчыкаў бібліятэчнай справы і кнігадруку, а таксама вядомых расійскіх і літоўскіх вучоных (А.Кавэцка-Грычова, Ю.Л.Лабынцаў, М.Підлыпчак-Майеровіч, Л.Л.Шчавінская і інш.).

Аналіз назапашаных ведаў па гісторыі беларускай бібліяграфіі сведчыць аб шматвектарнасці даследавання яе як гісторыка-культурнай з'явы. Структурызацыя гэтага масіву дазваляе вылучыць наступныя звёны: гісторыя беларускай бібліяграфіі ў цэлым (у тым ліку яе перыядызацыя); гісторыя беларускай бібліяграфіі ў асобных аспектах: тэарэтычным, арганізацыйным, метадычным, тэхналагічным, тыпа-відавым, змястоўным, персанальным, рэгіянальным, а таксама паэтапнае фарміраванне і развіццё названых элементаў.

Найбольш буйнымі працамі па гісторыі беларускай бібліяграфіі ў цэлым з'яўляюцца падручнікі В.Е.Лявончыкава "Беларуская бібліяграфія. Агульны курс" (Мн., 1981, 1991), дзе ўпершыню быў абагульнены матэрыял па ўсіх вышэйпералічаных аспектах айчыннай бібліяграфіі. Звесткі аб значных бібліяграфічных падзеях і фактах, звязаных з дзейнасцю бібліятэк да 70-х гг. XX ст., адлюстраваны і арганічна ўпісаны ў гісторыка-бібліятэчны працэс у манаграфіі М.І.Пакала "История библиотечного дела в БССР" (Мн., 1986).

У кнігах і артыкулах іншых даследчыкаў адлюстраваны асобныя кірункі развіцця беларускай бібліяграфіі, распрацоўваліся тэмы, якія абмяжоўваюць гістарычны працэс храналагічнымі ці змястоўнымі рамкамі. У гэтых крыніцах ёсць абагульненні і аналіз тыпа-відавой і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

змястоўных структур бібліяграфічнай інфармацыі, методыкі бібліяграфавання, звесткі аб арганізацыі бібліяграфічнай дзейнасці. Даецца характарыстыка асобных працэсаў, падзей, з'яў, буйнейшых бібліяграфічных прац, асвятляецца дзейнасць бібліёграфаў, змяшчаюцца каштоўныя гісторыка-бібліяграфічныя факты. Так, бібліяграфічная дзейнасць Нацыянальнай бібліятэкі на працягу 40 гадоў шматбакова раскрыта ў манаграфіі І.Б.Сіманоўскага "Белорусская советская библиография" (Мн., 1965), развіццё беларускай рэтраспектыўнай бібліяграфіі асветлена ў манаграфіі В.Е.Лявончыкава "Беларуская рэтраспектыўная бібліяграфія кніг" (Мн., 1971). Гістарычныя звесткі па шэрагу відаў беларускай бібліяграфіі змешчаны ў даследаванні "Отраслевые библиографии БССР" (Мн., 1979), уводных артыкулах да крыніц агульнай і спецыяльнай бібліяграфіі, у тым ліку да рэтраспектыўных і бягучых паказальнікаў бібліяграфічных дапаможнікаў ("Бібліяграфія беларускай савецкай бібліяграфіі" (Мн., 1963), "Библиографические пособия Белорусской ССР" (Мн., 1980), штогодніка "Паказальнік бібліяграфічных дапаможнікаў Беларусі"). Гэтыя прадмовы ў справе рэканструкцыі бібліяграфічнага мінулага маюць вялікае крыніцазнаўчае значэнне, у іх замацаваны не толькі метадычныя здабыткі, характэрныя для пэўнага перыяду развіцця айчыннай бібліяграфіі, але і мадэліруюцца гістарычныя веды аб бібліяграфічнай прадукцыі пэўнага віду, зместу, мэтавага і чытацкага прызначэння. Разнастайныя па зместу гісторыка-бібліяграфічныя матэрыялы былі апублікаваны ў зборніках "Из истории книги в Белоруссии", "Из истории книги, библиотечного дела и библиографии в Белоруссии", "Библиотечное дело и библиографоведение в БССР", "Книговедение в Белоруссии", "Вопросы библиографоведения и библиотековедения", "Вяртанне", "Здабыткі" і інш.

Калі прасачыць у гістарычным аспекце асаблівасці стварэння ведаў па гісторыі айчыннай бібліяграфіі, то можна адзначыць, што да сярэдзіны XX ст. яны былі нязначнымі па аб'ёме, апісальнымі і не мелі хранaлагічнай пераемнасці. У асноўным гэта былі звесткі аб бібліяграфічнай рабоце асобных дзеячаў культуры, літаратуры, навукі, кніжнай і бібліятэчнай справы, прычым нярэдка ў кантэксце агульных біяграфічных характарыстык. Некаторыя бібліяграфічныя факты прыводзіліся ў працах, прысвечаных пытанням адукацыі, дзейнасці бібліятэк. Нельга аднак лічыць, што асобныя тагачасныя дзеячы не імкнуліся да больш глыбокага вывучэння айчыннай бібліяграфіі. У свой час А.Ельскі падрыхтаваў для энцыклапедычнага выдання ар-

тыкул, прысвечаны беларускай бібліяграфіі і літаратуры. І хаця ён не ўтрымліваў гістарычных абагульненняў (зместам яго было бібліяграфаванне беларускамоўных тэкстаў), але ўводзілася паняцце “беларуская бібліяграфія”, і гэта стварыла важнейшую прыступку да пачатку асэнсавання гістарычнага шляху айчыннай бібліяграфіі.

Толькі ў другой палове XX ст. даследаванні па гісторыі беларускай бібліяграфіі ўзняліся на якасна новы ўзровень. На змену фіксаванню асобных гістарычных фактаў прыйшлі абагульненні і каштоўнасныя характарыстыкі бібліяграфічных з’яў. Найбольш інтэнсіўна вывучэнне бібліяграфічнага мінулага Беларусі здзяйснялася ў 70–80-я гг. XX ст., калі былі апублікаваны першыя буйныя вучэбныя і навуковыя матэрыялы (падручнік, манаграфіі), актыўна друкаваліся артыкулы на старонках вышэйназваных зборнікаў і некаторых перыядычных выданняў, пачалі абараняцца першыя дысертацыі, у якіх разам з тагачасным станам развіцця бібліяграфічных сістэм закраналіся і гістарычныя праблемы. Другая палова 90-х гг. XX ст. і пачатак XXI ст. у гэтым сэнсе менш выніковыя, і не толькі таму, што не было зроблена вялікіх работ абагульняючага характару, але і таму, што іх агульная колькасць скарацілася.

На сучасным этапе важным уяўляецца сістэматычнае стварэнне навуковых ведаў па гісторыі беларускай бібліяграфіі, пераасэсаванне яе сутнасці і ролі ў розныя гістарычныя перыяды. Неабходна стварэнне буйных абагульняючых гісторыка-тэарэтычных прац, якія адлюстроўваюць не толькі шматэтапны працэс развіцця беларускай бібліяграфіі як грамадскай з’явы, але і падкрэсляць яе значэнне для беларускай культуры, навукі і адукацыі, уздзеянне на фарміраванне светапогляду асобы, захаванне інтэлектуальнага ўкладу многіх пакаленняў нашых суайчыннікаў. На сённяшні дзень, нягледзячы на важнасць і значнасць бібліяграфічнай дзейнасці для грамадства, гісторыка-бібліяграфічныя факты практычна не трапляюць у даследаванні па гісторыі грамадства ў цэлым і асобных галіновых кірункаў (напрыклад, гісторыя навукі). Да таго ж пасля выхаду найбольш грунтоўных прац па гісторыі беларускай бібліяграфіі ў навуковы абарот уведзены новыя факты, змяніліся светапоглядныя арыенціры грамадства, стала магчымым больш поўнае прадстаўленне развіцця бібліяграфіі на асобных гістарычных этапах, напрыклад, у часы ВКЛ, Рэчы Паспалітай, у 20–30-я гг. XX ст. Таму актуальным бачыцца як ліквідаванне прабелаў у гісторыі беларускай бібліяграфіі, так і правядзенне новага фактапагічнага аналізу ўжо вядомых даных.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асобай увагі патрабуе адлюстраванне персанальнага аспекту беларускай бібліяграфіі. Надзвычай мала імён беларускіх бібліёграфаў можна сустрэць на старонках даведачных выданняў, навуковых прац па гісторыі культуры. Звесткі аб некаторых дзеячах і арганізацыях, бібліяграфічная дзейнасць якіх мела спадарожны характар у дачыненні да асноўнага кірунку, можна адшукаць у навейшых айчынных ці замежных даведачных выданнях. На жаль, бібліяграфічныя аспекты дзейнасці ў гэтых крыніцах не толькі не характарызуюцца, а часта нават і не ўпамінаюцца. Корпус жа айчынных бібліёграфаў вельмі значны, але надзвычай мала даследаваны. Неабходна стварэнне якаснай біяграфічнай інфармацыі як абагульняючага, так і фактаграфічнага характару. Бібліяграфічным камітэтам ББА, кафедрай тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый БДУ культуры зроблены некаторыя захады ў гэтым кірунку. Была распрацавана анкета, якая ў друкаваным і электронным варыянтах адпраўлялася ў бібліятэкі Беларусі і магла стаць асновай для стварэння даведніка “Бібліёграфы Беларусі”. На жаль, пакуль што сабрана мала звестак. Хочацца, каб бібліятэкі больш ініцыятыўна аднесліся да рашэння гэтых пытанняў.

Патрабуе пашырэння і кола даследчыкаў гісторыі беларускай бібліяграфіі. Нельга не адзначыць, што вывучэнне гэтага кірунку на сённяшні дзень не з’яўляецца прыярытэтным і нават прывабным для маладых навукоўцаў. Ён вельмі працаёмкі і патрабуе надзвычай шырокага навуковага кругагляду, які часам выходзіць за межы ўласна бібліяграфічных фактаў і з’яў. Да таго ж, улічваючы крыніцазнаўчы стан айчыннай бібліяграфіі, можа быць і не надта выніковым.

Мэтазгодным бачыцца ўдасканаленне вучэбнага гісторыка-бібліяграфічнага матэрыялу. І гэта не толькі перавыданне падручніка па беларускай бібліяграфіі, але і больш глыбокая структурызацыя гісторыка-бібліяграфічнай інфармацыі. Вялікі фактаграфічны матэрыял, без якога немагчыма абыйсціся пры выкладанні гэтай дысцыпліны, выклікае значныя цяжкасці для засваення яго студэнтамі. Дапамогай у гэтым магло б стаць стварэнне хранікальнай і персанальнай інфармацыі (аб якой гаварылася вышэй), распрацоўка ілюстрацыйнага матэрыялу. Нельга забываць пра істотныя крыніцазнаўчыя лакуны мінулага айчыннай бібліяграфіі. Часткова іх ліквідаваць дапамагла б хрэстаматыя ці поўнатэкставая база даных. А ўзмацніць педагагічны патэнцыял курса па гісторыі беларускай бібліяграфіі стварэнне прац папулярнага характару.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ